образнее отнести к компетенции судей районных (городских) судов, поскольку судьи обладают наиболее полным набором профессиональных и личностных качеств для вынесения законных, обоснованных и справедливых взысканий за рассматриваемые правонарушения.

На основании изложенного мы предлагаем дополнить ст. 3.2 ПИКоАП Республики Беларусь после слов «статьями 23.85,» словами «Главой 23[1],», а далее — по тексту статьи.

**_І.А. Доўнар_**
БДУ (Мінск)

## ЗЯМЕЛЬНЫЯ СУДОВЫЯ СПРЭЧКІ Ў БЕЛАРУСІ Ў XV—XVI стст.

З моманта ўтварэння ВКЛ спрэчкі аб вотчынным землеўладанні феадалаў, якое грунтавалася на даўнасці валодання (так званае «старыне»), былі падсудны Вялікакняжацкаму (Гаспадарскаму) суду. Даўнасць валодання пацвярджалася перш за ўсё рознымі пісьмовымі дакументамі і судовымі пастановамі. Даказваць правы на зямлю таксама можна было спасылаючыся, што ёю валодалі продкі, нават пры адсутнасці адпаведных дакументаў. Увогуле права валодання нерухомай маёмасцю пацвярджалася спецыяльнай вялікакняжацкай граматай.

Часам вялікі князь разам з панамі раднымі даручалі разгляд справы камісарскаму суду, асабліва калі гэта тычылася спрэчак аб межах землеўладанняў. Камісарскія суды ўзніклі па прычыне вялікай загружанасці вялікакняжацкага суда і ў сувязі з неабходнасцю па некаторых справах, якія паступалі да гаспадара, выязду на месца разгляду справы. Камісарамі былі спецыяльна вызначаныя службовыя асобы, часцей — некалькі паноў радных. Аб яго дзейнасці ўпершыню ўзгадваецца ў дакументах XV ст., дзе гэтыя суды ўпамінаюцца як «гаспадарскія камісіі», а суддзі — як «комиссары», «ездоки», «дельчьи», «судьи за комиссиями гаспадара» і інш.

Больш падрабязна яго дзейнасць рэгламентаваў Статут 1588 г., у якім гаварылася, што пакрыўджаны мае права звярнуцца да гаспадара і атрымаўшы лісты камісарскія, «справядлівасць сваю павінен даказваць перад камісарамі нашымі і там у доказах і ва ўсіх учынках прававых паводле гэтага Статута паводзіць сябе павінен».

Законамі 1564 і 1566 гг. быў створаны спецыяльны межавы суд – падкаморскі, у якім зямельныя спрэчкі вырашаў падкаморый з дапамогай каморнікаў. Рашэнне аб увядзенні ў дзеянне гэтых судоў было звязана з умацаваннем права прыватнай уласнасці феадалаў на зямлю, іх зацікаўленасцю ў зямлі. Статут 1566 г. дазволіў поўнае распараджэнне нерухомасцю. Шматлікія судовыя справы, змешчаныя ў Літоўскай Метрыцы, даюць уяўленне аб памерах і характары землеўладанняў ся-



БДЭУ. Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт. Бібліятэка.
БГЭУ. Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.°.
BSEU. Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by elib@bseu.by

рэдняй і дробнай шляхты, адносна якой мясцовая адміністрацыя з гэтага часу не павінна была перашкаджаць феадалам распараджацца.

Паводле Статута 1566 г., падкаморый прызначаўся непасрэдна вялікім князем. Яго пасада лічылася ганаровай і даходнай, таму што значная частка судовых пошлін, якія ўносілі бакі, ішла ў даход суддзі. З увядзеннем у дзеянне Статута 1588 г. чатырох кандыдатаў на гэтую пасаду выбірала шляхта на павятовых сойміках, а затым аднаго з іх зацвярджаў гасудар «до живота его або до повышенья».

Памочнікам падкаморыя ў вымярэнні і ўсталяванні межаў землеўладанняў служыў каморнік (па Статуту 1588 г. — два), якога прызначаў падкаморый са згоды мясцовых феадалаў. Судовыя расходы выплачваў вінаваты бок адразу ж пасля вырашэння справы «не откладаючы того на иншый час». Рашэнні падкаморскага суда падлягалі неадкладнаму выкананню, але маглі быць абскарджаны ў Гаспадарскі або Галоўны суд. Калі ж узнікалі паміж бакамі спрэчкі аб праве уласнасці на зямлю або маёнтак ці іншыя патрабаванні на маёмасць, падкаморскі суд іх не разглядаў і прапаноўваў звярнуцца ў земскі.

Такім чынам, можна зрабіць вывад аб тым, што ў феадальны перыяд у Беларусі спрэчкі аб зямлі разглядаліся спачатку рознымі судовымі ўстановамі, аднак у XVI ст. у кантэксце павелічэння правоў шляхты для разгляду іх зямельных спрэчак у паветах ствараюцца падкаморскія суды. Гэта былі выбарныя, аддзеленыя ад адміністрацыі суды, якія абаранялі ўжо не толькі дзяржаўныя інтарэсы, але ў першую чаргу — законныя правы і інтарэсы прыватных асоб, што сведчыла аб зараджэнні больш прагрэсіўных прынцыпаў судовага ладу і судаводства.

***А.П. Еленская***

БГЭУ (Минск)

## ФОРМЫ РАЗРЕШЕНИЯ СПОРТИВНЫХ СПОРОВ

Вопрос о разрешении споров в спортивной сфере в белорусской юриспруденции на данном этапе является практически неразработанным. Данное направление требует как доктринальной разработки, так и более детальной регламентации на уровне законодательства.

Наблюдающийся дефицит правовых норм порождает достаточно низкий уровень правового регулирования общественных отношений, связанных с профессиональным спортом и защитой прав лиц, которые им занимаются.

В правоприменительной практике Республики Беларусь, к сожалению, об органах и порядке рассмотрения спортивных споров мало известно.

Спорт чаще всего сопряжен с конфликтом. Последний развивается между различными субъектами: спортсменами, спортивными организациями, тренерами, болельщиками. Обусловлена такая тенденция тем,



БДЭУ. Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Бібліятэка.
БГЭУ. Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.°.
BSEU. Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by elib@bseu.by